Падтрымай "Вясну" на PATREON

Пратаколы на "Праспекце нацыянальнага сцяга" (абнаўляецца)

14.05.2016 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



14 траўня ў 12.00 распачалася мірная акцыя "Праспект нацыянальнага сцяга" на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску. Прыблізна пасля 15 хвілін ад пачатку мерапрыемства міліцыя пачала складаць пратаколы на ўдзельнікаў.

Як паведамляюць назіральнікі БХК і "Вясны", каля 6 супрацоўнікаў міліцыі складаюць пратаколы на актывістаў - **Пальчэўскага С.**, **Аксаміта Н.**, **Вінярскага М.**, **Кулакова Л.**, **Багінскую Н.**, **Бальшова А.** ды іншых - па арт. 23.34 КаАП "Парушэнне парадку арганізацыі ці правядзення масавага мерапрыемства". Таксама на плошчы прысутнічаюць і супрацоўнікі ў цывільнай вопратцы, супрацоўнікі ДАІ.



Удзел у мерапрыемстве бяруць каля 30 чалавек.

> Перакрылі частку прашпекту і мыюць вуліцу, каб людзі не бачылі акцыі.
>
> #ControlBY



На **Аляксандра Мартысевіча** склалі адразу два пратаколы: па арт. 23.34 і 23.4 КаАП. Супрацоўнік міліцыі, які складаў пратакол, пад асабістым нумарам **№Б47349,** выклікаў актывіста адразу і ў суд - 1 чэрвеня на 11.00. На гэты ж дзень выклікалі ў суд адразу на плошчы і **Мікалая Автуховіча**.

А на **Дзмітрыя Дашкевіча** склалі таксама два пратаколы: па арт. 23.34 і 17.1 "Дробнае хуліганства", за тое, што павесіў сцяг на слуп.

Таксама стала вядома пра затрыманне журналіста Радыё "Свабода" **Алега Груздзіловіча**, нібыта за тое, што ён выйшаў на праезжую частку. Яго пасадзілі ў машыну і звезлі ў невядомым накірунку.

Твитнуть









"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.COM



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць









ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY